Бібліятэка
АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Прачытаў—перадай другому.

# НАРОДНЫ МСЦІВЕЦ

Орган Окцябрскага РК КП(б)Б

№31(52) | Пятніца, 19 лістапада 1943 г. | выд. II г.

**Доблесная Чырвоная Армія ўступіла на нашу родную палескую зямлю.**

**Чырвоная Армія 18 лістапада вызваліла ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў раённы цэнтр Палескай обласці—ВАСІЛЕВІЧЫ.**

# ЗАГАД
## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

**7 лістапада 1943 года** **№ 309** **г. Масква**

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты, афіцэры і генералы, партызаны і партызанкі! Працоўныя Савецкага Саюза!

Ад імя Савецкага Урада і нашай большэвіцкай партыі вітаю і віншую Вас з 26-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі.

26-ю гадавіну нашай Вялікай Соцыялістычнай Рэволюцыі мы сзяткуем у дні слаўных перамог Чырвонай Арміі над ворагамі нашай Айчыны.

Ужо больш двух год вядзе наш народ вызваленчую вайну супроць нямецка-фашысцкіх прыгнятальнікаў. Год назад наша Радзіма перажывала цяжкія дні. Вораг захапіў у нас да таго часу вялікую тэрыторыю. Мільёны совецкіх людзей пакутвалі ў нямецкай няволі. Варожыя орды ірваліся да Волгі для абхода Масквы з усхода, асаджалі подступы к Закаўказзю. Але Чырвоная Армія грудзямі сваімі перагарадзіла шлях ворагу. Нашы войскі спынілі іншаземныя разбойніцкія орды, а затым, разбіўшы іх пад Сталінградам, імкліва пагналі іх на захад. З таго часу Чырвоная Армія беззменна трымае ў сваіх руках ініцыятыву ваенных дзеянняў.

Зімою 1942-43 г.г. нашы доблесныя войскі разбілі адборныя арміі немцаў, італьянцаў, румын, венграў, перабілі і запаланілі звыш мільёна варожых салдат і афіцэраў і вызвалілі велізарную тэрыторыю плошчай да паўмільёна квадратных кіламетраў.

Летам 1943 года Чырвоная Армія нанесла ворагу новы сакрушальны ўдар. Нашы войскі



на працягу некалькіх дзён ліквідавалі летняе наступленне немцаў і тым пахавалі гітлераўскі план разгрома асноўных сіл Чырвонай Арміі і абхода Масквы з боку Орла і Курска. Пасля таго, Чырвоная Армія сама перайшла ў рашучае наступленне, узламала магутныя абарончыя полосы праціўніка і на працягу трох месяцаў адкінула яго на захад месцамі на 400-450 кіламетраў. За час летняй кампаніі нашы войскі выгналі ворага з левабярэжнай Украіны, з Данбаса Гамані, Орлоўшчыны, Смаленшчыны, уступілі ў правабярэжную Украіну, авалодалі сталіцай Совецкай Украіны—Кіевам, уступілі ў Беларусь, занялі подступы да Крыма, вызвалілі звыш 160 гарадоў і 38.000 населёных пунктаў.

Чырвоная Армія адваявала ў немцаў за прайшоўшы год амаль дзве трэці нашай зямлі, захопленай раней немцамі, і вызваліла з пад нямецкага прыгнёту дзесяткі мільёнаў совецкіх людзей.

За прайшоўшы год немцы страцілі на совецка-германскім фронце звыш 4-х мільёнаў салдат і афіцэраў, з іх не менш 1.800.000 забітымі.

На совецка-германскім фронце знайшлі бясслаўны канец адборныя кадравыя дывізіі нямецка-фашысцкай арміі. Сумесна з імі назаўсёды пахаваны гітлераўскія планы заваявання міра і заняволення народаў.

Праўда, нямецкая армія і зараз дзярэцца ўпорна, чапляючыся за кожны рубеж. Але паражэнні, якія панесены немцамі з часу разгрома іх войск пад Сталінградам, надламілі баявы дух нямецкай арміі. Цяпер немцы, як агню, баяцца акружэння і пры пагрозе абходу іх нашымі войскамі бягуць, кідаючы на полі бою сваю тэхніку і раненых салдат.

У наступальных баях прайшоў-

(Працяг на 2-й старонцы)

жр 3268



# ЗАГАД ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА

## 7 лістапада 1943 года № 309 г. Масква

(Працяг)

шага года нашы войскі ўзбагаціліся вопытам вядзення сучаснай вайны. Нашы афіцэры і генералы ўмела кіруюць войскамі, паспяхова авалодваюць майстэрствам ваджэння войск. Чырвоная Армія стала самай магутнай і загартаванай сучаснай арміяй.

Перамогі Чырвонай Арміі яшчэ больш умацавалі міжнароднае становішча Совецкага Саюза. Наступленне нашай арміі было падтрымана баявымі дзеяннямі саюзных войск у Паўночнай Афрыцы, на італьянскіх астравах і на поўдні Італіі. Авіяцыя нашых саюзнікаў падвергла сур'ёзным бамбардыроўкам прамысловыя цэнтры Германіі. Няма сумнення ў тым, што ўдары Чырвонай Арміі па нямецкіх войсках з усхода, падтрыманыя ўдарамі асноўных сіл саюзнікаў з захада, прывядуць да сакрушэння ваеннай магутнасці гітлераўскай Германіі і да поўнай перамогі антыгітлераўскай кааліцыі.

Чырвоная Армія не змагла-б атрымаць вялікіх перамог гэтага года без усенароднай дапамогі фронту. Совецкі народ аддае ўсе сілы на падтрымку сваёй арміі. Бесперапынным патокам рухаюцца на фронт узбраенне, боепрыпасы, прадукты харчавання, снаражэнне. Урал і Кузбас, Масква і Паваложжа, Ленінград і Баку, Казахстан і Узбекістан, Грузія і Арменія, усе нашы рэспублікі і вобласці сталі магутным арсеналам Чырвонай Арміі. Совецкі народ паспяхова аднаўляе адваяваныя ад ворага прамысловыя і сельскагаспадарчыя раёны, пускае ў ход фабрыкі, заводы, шахты і чыгуначныя шляхі, адраджае соўгасы і калгасы, паварочвае рэсурсы вызваленых раёнаў на службу фронту.

Нашы поспехі сапраўды вялікія. Але было-б наіўна супакойвацца на дасягнутых поспехах Зараз, калі Чырвоная Армія б'е ворага за Дняпром і прабіваецца да заходніх граніц нашай краіны, было-б асабліва небяспечным прадацца благадушшу, самасупакоенасці і недаацэніць сур'ёзных цяжкасцей прадстаячай барацьбы. Цяпер вораг з асаблівай лютасцю будзе драцца за кожны кавалачак захопленай ім тэрыторыі, бо кожны крок нашай арміі ўперад набліжае час расплаты з немцамі за іх злачынствы, якія ўчынены імі на нашай зямлі.

Барацьба за канчатковую перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі патрабуе ад арміі і народа яшчэ большых намаганняў і новых подвігаў.

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты, афіцэры і генералы, партызаны і партызанкі!

У вялікіх бітвах з заклятым ворагам, Вы атрымалі буйныя перамогі, пакрыўшы баявыя сцягі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марского Флота няўвядаемай славай. Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот маюць цяпер усе магчымасці для таго, каб у бліжэйшы час поўнасцю ачысціць совецкую зямлю ад нямецкіх захопнікаў.

У імя перамогі нашай Радзімы над нямецка-фашысцкімі ізвергамі ЗАГАДВАЮ:

1. Усяму радавому і сержанцкаму складу—няўстанна ўдасканальваць сваё баявое майстэрства, стражайша выконваць патрабаванні статутаў і настаўленняў, загады камандзіраў і начальнікаў, заўсёды і ўсюды захоўваць узорны парадак, моцную дысцыпліну і высокую арганізаванасць.

2. Афіцэрам і генералам усіх радоў войск,—удасканальваць кіраўніцтва войскамі на полі бою і ўзаемадзеянне ўсіх радоў войск, моцна замацоўваць поспехі наступлення, імкліва праследаваць войскі праціўніка, хутка падцягваць тылы, смялей выкарыстоўваць рэзервы для новых удараў.

3. Усёй Чырвонай Арміі—смела і рашуча ўзламваць варожую абарону, дзень і ноч праследаваць ворага не даючы яму замацоўвацца на прамежных рубяжах, умелымі і смелым манеўрам рэзаць камунікацыі ворага, акружаць , драбіць яго войскі, знішчаць і захапляць жывую сілу і тэхніку праціўніка.

4. Партызанам і партызанкам—узнімаць совецкіх людзей на ўзброеную барацьбу супроць немцаў, усямерна ўзмацняць дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі, граміць тылы і штабы праціўніка, выратоўваць совецкіх людзей ад вынішчэння і ўгона на катаргу ў Германію, няшчадна знішчаць нямецка-фашысцкіх нягоднікаў!

Воіны Чырвонай Арміі, партызаны і партызанкі! Уперад за поўны разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў!

Няхай жыве 26-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі!

Няхай жыве наша пабеданосная Чырвоная Армія!

Няхай жыве наш пабеданосны Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жывуць адважныя партызаны і партызанкі!

Няхай жыве наша Вялікая Радзіма!

Помста і смерць нямецка-фашысцкім захопнікам!

**Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.**

## З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ СОВІНФОРМБЮРО

(Агляд з 10 па 19 лістапада)

На працягу 9 дзён баёў нашымі войскамі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў раённыя цэнтры Кіеўскай вобласці: Макараўка, Бышаў, Обухаў, Развежаў і горад Чэрнобыль. У Житомірскай вобласці гарады: Радамышль, Брусілаў, Карнін, Малін, Чэрняхоў, Пацiеўка, Оўруч і буйны чыгуначы вузел, Корасцень і буйны чыгуначны вузел. Раённыя цэнтры—Чапоавічы, Народзічы. Чыгуначныя станцыі—Цяцераў і Чэрняўка.

У Беларусі вызвалены горад Рэчыца і раённы цэнтр Палескай вобласці-Васілевічы.

З 10 па 19 лістапада знішчана танак праціўніка—740, самалётаў—131.

Выданне Октябрскага РК КП(б)Б

Рэдакцыйная калегія